**Сафронаў, М.** Ляцелі пад адхон эшалоны / М. Сафронаў, С. Кірыёнак // Віцебскі рабочы. – 1971. – 22 чэрв. – С. 2.

## ЛЯЦЕЛІ ПАД АДХОН ЭШАЛОНЫ

З першых дзён акупацыі Мехаўскім падпольным райкомам партыі быў арганізаван партызанскі атрад. У ім налічвалася нямнога людзей, але дзеянні яго былі надзвычай актыўнымі. Партызаны вялі прапаганду сярод насельніцтва, нападалі на нямецка-паліцэйскія гарнізоны, знішчалі працаваўшыя на ворага прадпрыемствы, спальвалі аўтамашыны, мініравалі дарогі. Поспехі даваліся нялёгка. Дзясяткі мсціўцаў загінулі ў барацьбе. У самым пачатку вайны аддалі жыццё за Радзіму А. П. Бараноўскі, Н. А. Скарабагатаў, П. М. Гуляеў, Ф. Германтаў і іншыя.

Пасля разгрому гітлераўцаў пад Масквой партызанскі рух узмацніўся, народныя мсціўцы арганізаваліся ў групу. Узначаліў яе начальнік Мехаўскага раённага аддзялення міліцыі Міхаіл Іванавіч Дзьячкоў. У канцы лютага 1942 года яго група складвалася ўжо з некалькіх атрадаў і неўзабаве перарасла ў брыгаду, якая ў далейшым стала называцца 2-й Беларускай імя П. К. Панамарэнкі.

Брыгада хутка расла. Да канца 1942 года яна налічвала ў сваіх радах больш 1500 чалавек, што дало магчымасць разгарнуць шырокія баявыя аперацыі. Памяць захавала рад эпізодаў той пары.

Усё лета і восень 1942 года вораг не мог па-сапраўднаму карыстацца ні шасейнай дарогай, ні чыгункай Віцебск – Невель. Не адзін эшалон, не адна калона аўтамашын былі знішчаны партызанамі. У сакавіку быў разгромлен нямецка-паліцэйскі гарнізон у пасёлку Смалоўка, дзе патрыёты знішчылі больш пяцідзесяці фашыстаў і паліцаяў. 3500 гітлераўцаў гарнізона, які стаяў у вёсцы Лёхава, было знішчана больш палавіны, спалена 4 браневікі, узарваны склады з гаручым і боепрыпасамі. На працягу лютага–красавіка 1942 года былі разгромлены ўсе паліцэйскія гарнізоны ва ўсходняй частцы раёна.

22 лютага 1943 года фашысты пачалі карную экспедыцыю. У бой былі кінуты авіяцыя, артылерыя, танкі, мінамёты, лыжнікі, аўтаматчыкі. Сілы ворага ў многа разоў пераўзыходзілі нашы. Карнікі па-зверску распраўляліся не толькі з захопленымі патрыётамі, але і з мірным насельніцтвам. Знішчыць партызан гітлераўцам так і не ўдалося. У сакавіку брыгада вырвалася з акружэння і перайшла лінію фронту.

За час сваёй дзейнасці партызаны 2-й Беларускай брыгады знішчылі больш 6-ці тысяч гітлераўскіх салдат і афіцэраў, звыш двухсот паліцэйскіх, падарвалі і спалілі каля 300 грузавых і легкавых аўтамашын з жывой сілай і рыштункам, знішчылі 8 бронемашын, 10 танкаў, 16 складоў, пусцілі пад адхон 28 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага. На рахунку байцоў тры збітыя самалёты, дзясяткі кіламетраў пашкоджанай сувязі, каля чатырох тысяч падарваных рэек, тысячы выратаваных ад фашысцкай няволі савецкіх людзей.

Сваімі гераічнымі дзеяннямі партызаны 2-й Беларускай брыгады праславіліся на ўсю вобласць. Дзе б ні дзейнічалі яе байцы, якое б заданне ні выконвалі, яны заўсёды адчувалі падтрымку і дапамогу насельніцтва, накіроўваючую сілу нашай партыі і ўрада.

**С. САФРОНАЎ,**
**былы камісар брыгады**
**С. КІРЫЁНАК,**
**былы камандзір 4-га партызанскага атрада**